"Как любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць..."

МАЛАНКА



Бюлетэнь–газета Іркуцкага таварыства Беларускай культуры ім. Я.Д.Чэрскага

№2 (49) ЛЮТЫ 2004 год наклад 800 асобнікаў

У ЛЮТЫМ НАРАДЗІЛІСЯ СЯБРЫ НАШАЙ СУПОЛКІ

1 лютага нарадзіўся Гузік Васіль Васільевіч; 4 лютага – Мальцава Маша; 5 лютага – Банчук Надзея Васільеўна; 10 лютага – Пермінава Феафанія Антонаўна; 13 лютага – Елікава Тамара Рыгораўна; 18 лютага – Верамееў Леанід; 19 лютага – Берднікава Святлана, Замарэеў Александр Мікалаевіч, Шматчанка Ганна Аляксандраўна; 25 лютага – Верамеева Алена Іванаўна; 26 лютага – Шынкароў Уладзімір Віктаравіч; 27 лютага – Вайцюк Людміла Аўрамаўна;

Шаноўныя спадарыні і спадары! Ад імя Рады ІТБК і Рэдакцыі «Маланкі» віншуем Вас з Днём нараджэння! Жадаем моцнага здароўя, посьпехаў у справах, асабістага шчасця, добрага настрою і трывалага Кахання!

Спадзяёмся, што Вы заўжды будзіце прымаць актыўны ўдзел у справах нашай суполкі, дый на карысць нашай любай Бацькаўшчыны.

Усяго Вам найлепшага!

Падзеі і справы ІТБК

Усе на Сход – Все на Собрание!!!

Рада Иркутского городского отделения ИТБК на своём Заседании 25 февраля 2004 года приняла решение о проведении общего отчётно-выборного городского собрания 13 марта 2004 года.

Собрание состоится по адресу: ул. Марата, д.14, в актовом зале Администрации Правобережного округа города Иркутска.

УВАГА – ВНИМАНИЕ:

Все члены ИТБК, которые официально зарегистрированы должны быть в обязательном порядке на данном собрании. Наше собрание будет легитимным, если мы соберем кворум.

Те члены ИТБК, кто не может присутствовать на собрании по уважительной причине (болезнь, командировка, дежурство) должны оповестить заранее Раду ИТБК по телефону 20-11-72.

Повестка собрания:

1. Отчёт Председателя Иркутского городского отделения ИТБК (Бизикова Т. А.)
2. Выборы Председателя Иркутского городского отделения ИТБК.
3. Выборы Рады (5 человек) Иркутского городского отделения ИТБК.
4. Планирование работы ИГО ИТБК на текущий год.

Рада ИТБК.

Падзеі і справы ІТБК

Грамніцы мы сустрэлі, песьні добра пелі,
Злых духаў адганялі, дабрабыт прыдбалі.

«Калі адліга на Грамніцы – Вясна будзе цёплая, калі марозы завярнуць, то халодная»

18 февраля Молодёжный клуб «Крывічы» провёл очередной тематический информационно-развлекательный сбор молодёжи «Вячоркі». На этот раз активисты МК «Крывічы» выбрали тему «Грамніц», тем более, что и дата почти совпадала с этим календарным праздником.

Ниже мы публикуем исторический очерк посвящённый «Грамніцам» и общий сценарий-схему проведения обряда на наших «Вячорках». Центральным звеном у нас был ритуал с «грамнічнай» свечой. А развлекательный момент приукрасили шутливые игры-соревнования команд «Зимы» и «Лета».

Кстати, команда Зимы в этот раз победила и … зима в Иркутск вернулась 30-градусным морозом.

Грамніцы.

ВСТУПИТЕЛЬНОЕ СЛОВО.



Белорусский обряд «Грамніцы» уходит в далёкое прошлое наших предков, в древнеславянскую эпоху. Обряд имеет и второе название «Стрэчэньне».

Итак, давайте разберемся, почему этот обряд так называется и каково его значение.

Белорусы издревле заметили удивительную особенность Природы. После сильных январских морозов обычно наступает резкое потепление. Позже в конце февраля, начале марта вновь могут ударить морозы, замести метели. Конечно же это явление народный календарь наблюдательных наших предков обойти не мог. Возник целый Обряд, который несёт множество различных поверий, поговорок, примет.

15 февраля каждый год белорусы отмечают «Грамніцы». Почему? Да потому, что в этот День Зима с Летом встречается – отсюда и второе название «Стрэчаньне», т. е. «Сустрэча» (бел.) – «Встреча». А вот Вам и вариант белорусской обрядовой песни в этот День:

А ў нас сёньня Стрэчаньне, Стрэчаньне,
Зіма з летам стрэлася, стрэлася,
Лета зіму піхнула, піхнула,
І ножачку зьвіхнула, зьвіхнула.
Зіма пайшла плачучы, плачучы,
Лета пайшло скачучы, скачучы.

Итак, почему «Стрэчаньне» понятно. А вот почему основное название «Грамніцы». Кто-то скажет от слова «Гром». Но разве зимой в феврале кто-нибудь из Вас слышал Гром? Лично я нет. Так в чём же дело?

Ответ кроется в древнем миропонимании белорусов. Многим из вас известно, что в белорусской мифологии есть Бог грома и молнии – «Пярун». До сих пор в белорусских деревнях (я это помню с детства) если прогремит сильный гром, то люди говорят: "Во Пярун жахнуў». А если увидят молнию, могут добавить «Гэта Пярун пускае стралу».

«Пярун» - грозный богатырь с сивыми, или огненно-рыжими кучерявыми волосами и длинной бородой. В руке держит лук со стрелами-молниями. Ходит по небу и высматривает, не творит ли кто из людей беззаконие. А если увидит, то может среди ясного неба и громом прогреметь, чтобы предупредить несправедливость, а иной раз и молнию пустить, чтобы наказать. Поэтому то в народе и укрепилась пословица-предупреждение: «Как гром среди ясного неба». «Пяруна» почитали и поклонялись ему все белорусские князья и дружинники.

Но была у «Пяруна» жена, которую звали «Грамаўніца», или «Грамніца». По представлению белорусов, это была красивая полная добрая мягкая женщина с головой украшенной спелыми колосьями и с плодами в руках. Она покровительствовала крестьянам, и именно её просили о дожде в нужное время.

Белорусы верили, что когда «Пярун» с «Грамаўніцай» ложились на зиму спать, то именно «Грамаўніца» просыпалась среди зимы и всматривалась на землю: не сильно ли лютует Зима. Самое главное, что белорусы ждали, чтобы «Грамаўніца» проснулась. Надеялись на это. Связывали с этим множество народных примет: «Калі на Стрэчаньне певень пад страхой нап'ецца, то на Юр'я (6 траўня) вол травы наесца»; «Калі адліга на Грамніцы – Вясна будзе цёплая, калі марозы завярнуць, то халодная»; «Капеж на Стрэчаньне – добры будзе ўраджай пшаніцы» и т.п.

Олег Рудаков.

(Продолжение темы на стр. 3)

(Продолжение. Начало на стр.2.)

ОСНОВНАЯ ФОРМА ПРОВЕДЕНИЯ ОБРЯДА «ГРАМНІЦЫ»

(с пояснениями)

1. Вначале зажигается большая «Грамнічная» свеча с ритуальными словами:

А ў нас сёньня Грамніцы,
Зімы палавіцы.
Няхай Лета ў акенца пастукае,
Громам ясным у небе пагрукае.
Сьвячу грамнічную запальвае.
Духаў злых адважвае.
А мы Грамніцы шануем,
Разам зьбіраемся й сьвяткуем.

С зажжённой большой свечой все участники Обряда выходят в коридор и под ритуальную песню (см. ниже) «Глава» дома крест-накрест (по диагонали, от угла к углу) «освещает» двери и комнаты.

Зіма з летам сустрэла… У-у-у!
Сустрэлася,
Зіма ў лецечкі пытала… У-у-у!
Пыталася:
- Ці было лета, ці не бува… У-у-у!
Не бывала,
Маці на вулку не пуска… У-у-у!
Не пускала,
Усё каморачку замыка… У-у-у!
Замыкала,
А ў каморачцы вакеня… У-у-у!
Вакенячка,
А ў вакенячку кватэра… У-у-у»
Кватэрачка,
Ох, кіну-гляну ў вакеня… У-у-у!
У вакенячка,
Да й на вуліцы пылок мя… У-у-у!
Пылок мяце,
Божая маці танок вя… У-у-у!
Танок вядзе,
Шчэ й з маладымі дзяўчата… У-у-у!
З маладымі дзяўчатамі,
А шчэ й з намі сяброўка… У-у-у!
Сяброўкамі.

Пояснения: зажжённая свеча – это отголосок древнего поклонения наших предков Огню. Наблюдая за явлениями Природы белорусы замечали, что от молний очень часто зажигается Огонь, который уже необходим Человеку для согревания и приготовления пищи. В то же время наши предки уже учились добывать Огонь самостоятельно, путём трения двух деревянных палочек, располагая их крест-накрест. Ну а необходимость ритуального обхода дома со свечой убеждал белорусов в отпугивании злых духов, и скорейшего прихода Тепла в этот дом. Причём со свечой наши предки обходили и все хозяйственные постройки (хлев, сарай и т.п.), а также обходили всю живность и всех членов семьи. «Грамнічныя» свечи несли оберегательный смысл. Они могли использоваться в дальнейшем на Юр'ю (с этой свечой обходили перед выгоном скотину); перед посевом обходили поле; встречали молодых на свадьбе; шли искать Папараць-кветку на Купальле, и т.п.

2. Все участники Обряда становятся в круг с маленькими не зажженными свечами. «Ведущий» с большой зажжённой свечой подходит к каждому и обводит вокруг головы «главную» свечу. Участник должен сказать одну из грамничных белорусских пословиц. После этого от «главной» свечи зажигается «маленькая» свеча. И так происходит со всеми.

Грамничные пословицы:

- Да Грамніц не скідай рукавіц, а як прайшлі Грамніцы, то ўжо не патрэбны рукавіцы.
- Калі на Стрэчаньні рана з'явіцца сонца, то будзе ранні лён.
- Калі на Грамніцы снег перамятае цераз дарогу, то будзе позьняя восень.
- Калі на Грамніцы растане снег, то на Юр'я будзе трава.
- На Стрэчаньне зіма на мароз ідзе, а сонца на лета.
- На Стрэчаньні сьняжок, вясной дожджык.
- Прагляне сонца скрозь хмары – на цяпло, а не прагляне – чакай моцных маразоў.
- На Стрэчаньне зіма з летам сустрэлася і з дарогі не зварочвае, а лета яе ў зубы б'е: зубы трашчаць, дзеці, зьбіраючы іх, пішчаць (это значит сосульки пяовились).
- Раніцай на Грамніцы выпадзе сьнег, чакай ранняга ўраджаю; у поўдзень – сярэдняга, да вечара – позьняга.
- Калі вецер на Грамніцы дзьме, дык з дрэваў нячысьцікаў здымае, летам ураджай фруктаў багаты будзе.
- Кармі на Стрэчаньне курэй аўсом, вясной будзеш з яйцом.
- Сьвятое Стрэчаньне свечы сукае, лета сустракае.
- Грамніцы – хлеба палавіцы, а зімы трэццяя частка.
- На Грамніцы мяцеліца, вясна будзе позьняй.

После того как все свечи зажжены, «ведущий» выходит в центр и говорит ритуальные слова:

Грамніцы мы сустрэлі,
Песьні добра пелі,
Злых духаў адганялі,
Дабрабыт прыдбалі.

Пояснения: *Это самое основное обрядовое действие. Каждый участник Обряда может с собой взять свою свечу и хранить её. При необходимости применять. Капли от грамничной свечи можно обламывать и носить при себе как оберегательные амулеты. Известны случаи, когда из переплавленной свечи вылепливали ту часть тела, которую хотели вылечить от болезни. Эту же свечу в сочетании с лекарственными травами использовали для «окуривания» различных приспособлений труда, скотину, одежду и т.п.*

3. Молодёжь рассаживается кругом. Выбираются две девушки – Зима и Лето. Между ними идёт шутливый диалог-ссора:

- Дзень добры, цёплае лецечка!
- Дзень добры, халодная зімачка!
- Чаму цябе, лецейка, узвелічваюць, мяне, зімачку, праклінаюць?
- Бо ты, зімачка, халодная, лугі, балоты памарозіла. А я, лецечка, да вясёлае, лугі, горы ізмачыла, лугі горы ўзвясяліла.
- Добрага здароўя, табе лецечка з кіенькамі!
- Добрага здароўя, табе зімачка з кастылькамі!

После этого Зима и Лето выбирают себе помощников – команду. И устраивают шутливые соревнования в играх, танцах, песнях.

Дзіцячая старонка « Зярнятка»

КОНКУРС ДЕТСКИХ ТВОРЧЕСКИХ РАБОТ – ИССЛЕДОВАНИЙ

"Мой род, моя семья"

Посвящается 8 – летию создания в Иркутске Товарищества белорусской культуры.

Звяры, што блукаюць па лесе, маюць логавы свае;
птушкі, што лётаюць па небе, маюць гнёзды свае;
...так жа і людзі да тых мясцін, дзе нарадзіліся,
вялікую любоў маюць. (Ф. Скарына)

Ты родился на иркутской земле? А ваши родители? А дедушка с бабушкой? Как они оказались в Иркутске? Что белорусского привезли с собой? Рушничок (полотенце)? Песню? Историю? Легенду? Шутку?...Расскажи нам. И тогда память поколений будет жива. И заслуга в этом великом деле будет принадлежать и тебе. Мы объявляем конкурс детских литературно – художественных работ « Мой род, моя семъя». Возраст участников – от 8 до 16 лет. Язык - русский или белорусский. Фотографии и рисунки повышают ценность работы. Отбор лучших работ будет производиться по двум номинациям: художественные работы (рисунки любого размера, фотографии) и литературные произведения (рассказы, стихи, сочинения, очерки, заметки и др.)

Белорусских ты кровей?
Бери ручку, не робей.
«Род, традиции семьи»
Эту тему разверни.
Расскажи нам о себе,
О себе и о родне.

Как в Сибирь попали?
Что переживали?
Кем гордитесь в родове?
Что узнали о себе
От своих родных и близких?
Будет вам поклон наш низкий.

Работы победителей будут представлены на специальном выставочном стенде во время проведения Недели белорусской культуры в Иркутске. Победители – награждены.

Это белорусский орнамент веры. Мы верим в возрождение белорусской культуры здесь, на иркутской земле.

Арнамент №2



Ці ведаеце вы сваю гісторыю? (Знаете ли вы свою историю?)

Международный, детский, литературно – художественный ***конкурс*** «**Нашчадкі змагарнай славы**» (Наследники боевой славы) проводит ЗБС «Бацькаўшчына» (Объединение белорусов Мира) среди школьников 12 – 14 лет. Принимаются рисунки размером А – 3 и А – 2, а также рассказы, стихи, сочинения, очерки и др., которые иллюстрируют события и судьбы исторических личностей со времён Рагвалода и Рагнеды до 20 века и посвящённые борьбе белорусов за независимость Родины. Укажите свою фамилию, имя, дату рождения , адрес, телефон. Работы принимаются до 20 апреля по адресу:

ул. Революционная, 15, г. Минск.., 222003

Дорогие ребята, в прошлом номере мы приглашали вас стать корреспондентами, фотокорреспондентами нашей газеты. Сегодня мы публикуем ваши первые заметки. Авторам 9-10 лет.

Шукаю сяброў (Ищу друзей)



Я Маша. Мне 9 лет. Я счастливый человек, потому что у меня очень хорошая мама: добрая, весёлая и красивая. Учусь я на четвёрки и пятёрки. Мне очень нравится с классом изучать Беларусь. Это так интересно и познавательно. У меня самая лучшая подруга Катя. Кате тоже 9 лет. Мы с ней подружились во втором классе. Она весёлая и имеет чувство юмора. Я думаю, что ей тоже нравится изучать Беларусь. Мы хотим завести новых друзей. Пишите нам по адресу: г. Иркутск, ул. Гидростроителей, д. 6, школа №64, 3в класс. Ерышева Маша

Першыя крокі (Первые шаги)



Гостеприимство – традиция.

В нашем классе проходит много интересных мероприятий. И, конечно, какой праздник без гостей? Были у нас члены Белорусского Общества, как здорово они колядовали! Самые частые гости – это наши родители. Мы рады гостям не только в праздники, но и в будни. Мы стараемся поддерживать добрые традиции.

Шваненберг Дима

Ансамблю «Ленушка» 15 лет.

Мне очень понравилось на концерте, посвящённому 15 – летию ансамбля «Ленушки». Концерт проходил в Центральном Дворце Детского Творчества, в актовом зале. Ансамбль пришло поздравлять много гостей, другие коллективы народной песни нашего города. Ребятам нашего класса и гостям очень понравилось. Концерт был ярким и запоминающимся.

Кузнецов Илья

Наши увлечения.

Мне очень нравится урок труда, потому что на нём мы всем классом вышиваем крестиком. Я люблю вышивать, особенно крестиком, потому что это очень увлекательно и интересно. Хотим сделать красивое белорусское полотенце.

Прохорова Настя

Вышивка.

Мы юные культурологи. Мы изучаем обычаи белорусского народа. На уроке труда наша учительница Татьяна Александровна научила нас вышивать белорусский орнамент. У нас у всех очень хорошо получается вышивать. Орнаменты очень красивые и красочные, вышиваются красными нитками. Я очень люблю это занятие.

Сергеева Алёна

Отдохнём! Соедини пословицы и поговорки с их переводом.

Кніжка чалавеку – што ліпа пчолцы.	Каждая сосна своему бору песню поёт
Кожная сасна свайму бору песьню спявае.	Не тот много знает, кто долго жил, а тот, кто много учился.
Не той шмат ведае, хто доўга жыў, а той, хто шмат вучыўся.	Книга человеку – что липа пчёлке.

Нам пішуць

Уважаемый Рудаков Олег Васильевич!

От всей души поздравляю Вас с Днём защитника Отечества!

Пусть будет Ваша жизнь светла, пусть мимо Вас пройдут невзгоды и ненастья,

Здоровья вам, семейного тепла, благополучия и счастья.

Желаю большого личного счастья, праздничного настроения и уверенности в завтрашнем дне.

Мэр г. Иркутска В. В. Якубовский.

Паважаны спадар Рудакоў!

Паведамляем Вам, што два нумары «Маланкі» і кішэнныя каляндарыкі, дасланыя на наш адрас, мы атрымалі. Вялікі дзякуй за прыемны падарунак і за Вашу працу, якая гуртуе беларусаў Прыбайкалля.

Нам вельмі спадабаліся Вашыя каляндарыкі: добры дызайн, высокаякасная паліграфія. Цікава было пазнаёміца з матырыяламі «Маланкі», даведацца аб тым, чым займаецца грамадскае аб'яднанне. Не сумняваемся, што Ваша газета карыстаецца папулярнасцю сярод беларусаў, што апынуліся на Іркуцкай зямлі.

Добра і тое, што на старонках газеты вы ўшаноўваеце сяброў Таварыства, віншуеце іх з Днём народзінаў.

На падставе матэрыялаў «Маланкі» мяркуем у «Нашым слове» змясціць інфармацыю пра дзейнасць Вашага Таварыства. Жадаем Вам поспехаў і задавальнення ад грамадскай працы на карысць тых, хто памятае і хоча ведаць сваю Радзіму.

Дасылаем Вам нашу друкаваную прадукцыю – газеты «Новы час» і «Наша слова», а таксама кішэнны каляндарык з выявай Васіля Быкова ў сувязі з ягоным 80-годзем ад дня народзінаў.

З павагай Ірына Марачкіна, адказны сакратар ТБМ.
18 лютага 2004 г. Менск.

P.S. Нізкі паклон Вам ад кіраўніцтва ТБМ, найперш, старшыні Алега Трусава і ягоных намеснікаў.

Спадар Алег!

Дзякуй за "Маланкі", календары.

І Вам жадаем усяго самага найлепшага ў жыцці і дзейнасці.

Мы тут у Літве перажываем нялепшы час – газету выпусціць, вельмі складана – патрабуюцца вялікія сродкі, а мы маем толькі ад падпісчыкаў. Ні Літоўскі ўрад, ні амбасада ніколі не падтрымлівалі нас, роват маральна, а толькі душаць. Літоўцы ўсюды крычаць, што Вільня толькі літоўская і ні чыей іншай не была а ж з 1323 году, а так як яна была заўсёды беларускай і габрэйскай, то ўсё беларускае яны прыцiскаюць.

Ну а беларускія суполкі Вільні і Літвы падзяліліся на прыхільнікаў Лукашэнкі (іх больш) і на апазіцый. Паміж сабой ідзе сварка і непрыязнь.

З павагай Саўчанка Павел. г. Вільня

Прывітанне, Алег!

Мы ў БЭЗе (Беларуска-эстонскае згуртаванне) заўсёды з цікавасцю даведваемся пра навіны з вашай суполкі. На жаль, наша дзейнасць не так багатая на навіны. Пасля праведзенага фестывалю беларускага гумару у верасні зараз глыбокі зацішак, пераводзім дух. Але ж у сакавіку будзе наша свята - 15-гадовы юбілей нашай суполкі. Плануем даволі многа мерапрыемстваў - запрошаны нашы сябры: паэт Генадзь Бураўкін, ансамбль "Паазер'е" і Дом народных рамёслаў "Стары млын" з Пастаў, самі рыхтуем канцэрт. Запланаваны і паказ фільмаў пра Беларусь па мясцоваму тэлебачанню. Ды нешта ў Міністэрстве культуры Беларусі разгубіліся, не ведаюць дзе можна набыць стужкі. Магчыма, мы не да таго чалавека звярнуліся. Здаецца, у вас гэтае мерапрыемства было раней, дык падкажыце нам, калі ласка, да каго трэба звяртацца за дапамогай у гэтым пытанні.

Жыве Беларусь!!! З павагай і надзеяй Сцяпан Разанка.

Ад Рэдакцыі: Шаноўны спадар Сьцяпан Разанка, дзякуй за добрыя словы і адзнаку нашай дзейнасьці. Сапраўды мы маем вопыт Тыдня беларускага кіно ў кінатэатрах Іркуцка. Аднак фільмы мы знайшлі ў архівах Іркуцкага кінафонда, за выключэньнем беларускай камедыі (яна была адзіная поўнасьцю на беларускай мове, і менавіта на яе прыйшло больш за ўсё гледачоў) «Купальская ноч», якую мне запісалі на звычайную відэакасету мае менскія сябры Панады. Была невялікая цяжкасць знайсьці відэапраектар, але затое заля была задаволена цудоўным беларускім каларытам.

Белорусы Кузбасса,

сердечно поздравляют белорусов Иркутской области с Новым Годом и Рождеством.

Желаем всем крепкого здоровья, счастья, радости, успехов во всех делах личных и на благо Беларуси и России.

Председатель обл. общ. орг. «Кузбасская община «Беларусь»

Михаил Брилёв

Алег, с большим удовлетворением вспоминаю Дни Белорусской культуры в Новосибирске. Надеюсь на встречу. Обнимаю и крепко жму руку.

С уважением М. Брилёв

Usich z sviatami vinszuje siamja Dyn'kou!
Pospiechau i sustrecz u Novym hodzie!
Uscinnia, Jakub, Alaksandra, Andrej.

Да грамадзян Беларусі!

Зварот дэлегатаў VIII з'езда грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны»

Шаноўны суайчыннік!

Хто б ты ні быў – жанчына ці мужчына, дарослы ці малады, селянін, студэнт, рабочы, настаўнік, вайсковец, інжынер ці бізнесовец – ведай, што найлепшы твой твар, вопратка твая, душа твая – беларуская мова.

Калі ты чуеш яе – ці то сучасную літаратурную, ці змешаную трасянку або мясцовую дыялектную – знай, што гэта ўсё яна – наша беларуская мова. Не адварочвайся, а прымі яе, бо яе месца ў тваёй краіне. І не падчарка яна тут, а паказвае на спрадвечнасць беларусаў на сваёй зямлі. Нашы бацькі, дзяды і прадзеды нямала зрабілі, каб беларуская мова была прызнаная як роўная сярод іншых моў свету.

Будзь і ты разам з тымі, хто думае пра яе будучыню. Размаўляй па-беларуску, бо заўтра наша мова табе, тваім дзяцям і ўнукам стане неабходнай. Размаўляй па-нашаму, каб людзі бачылі тваю вернасць сваёй мове. Размаўляй з прыветнай усмешкай, з пяшчотай на вуснах – і тваёй мовай захочуць гаварыць іншыя. І не саромся недасканалай гаворкі. Мова – жывая тканка, прырастае там, дзе крынічыць людское жаданне. Ведай: учора ты яшчэ не гаварыў па-беларуску, сёння размаўляеш на трасянцы, а заўтра будзеш гаварыць на чыстай літаратурнай мове.

А людзі, што служаць дзяржаве на чынавенскай пасадзе, табе дзякуй скажуць, бо будуць вучыцца ад цябе. А блізкія і далёкія суседзі адчуюць тваю самапавагу і будуць яшчэ больш цябе паважаць.

З беларускай мовай нам жыць у XXI стагодзе!

«Беларускі Дайджэст» Сьнежань 2003 г.

Падзеі і справы ІТБК

Новости ИТБК одной строкой:



Диплом

Комитет по связям с общественностью и национальным отношениям
аппарата губернатора Иркутской области

в рамках третьего областного конкурса журналистских материалов 2003 года
«Сибирь – территория согласия»

коллективу редакции газеты «Маланка» Иркутского товарищества белорусской культуры имени Я.Д. Черского (редактор О. Рудаков) за постоянное освещение культурной жизни и истории белорусов.

Председатель жюри А.И. Васильев

Пожалуй, и вправду можно сказать, что «маховик» деятельности ИТБК запущен очень мощно. События иногда настегают нас даже вопреки нашим планам.

Но, пожалуй, всё по порядку.

Описывать дела нашего Товарищества в феврале придётся с 30 января, так как в этот день на подведении итогов Третьего областного конкурса журналистских материалов 2003 года «Сибирь – территория согласия» совершенно неожиданно коллективу редакции газеты «Маланка» вручили Диплом «за постоянное освещение культурной жизни и истории белорусов».

Конечно же, признаться честно мы этого не ждали, так как не считали свой бюллетень профессиональным изданием. А в конкурсе было условие, что только профессиональные СМИ могут представлять свои материалы. А мы даже не удосужились написать заявку. И вот такая неожиданность. Впрочем, по мнению Жюри, наша газета за последние годы значительно выросла и стала заметной в информационной жизни Иркутска. А поэтому, награда эта и признание вполне заслуженное.

18 февраля Молодёжный клуб «Крывічы» провёл плановые молодёжные «Вячоркі», посвящённые древнему белорусскому Обряду «Грамніцы».

24 февраля наши ансамбли – фольклорный «Ленушка» и танцевальный «Самоцветы» – достойно представили белорусскую культуру на Межнациональном областном фестивале «Радуга над Байкалом».

С 27 по 29 февраля в выставочном зале «Сибэкспоцентр» в рамках программы «БайкалТур» ИТБК успешно представляло свою экспозицию, на которой кроме хорошо оформленного стенда были показаны изделия из соломки, женский и мужской национальные белорусские костюмы. Таже была организована бесплатная раздача газеты «Маланка» и продажа белорусских аудиокассет.

Вот такие новости одной строкой.

Олег Рудаков.

Зіма скончылася для ІТБК цікавай падзеяй



Зіма скончылася для ІТБК цікавай падзеяй: 26, 27, 28 *лютага ў трэццім* залі Сібэкспацэнтра мелася стэнд-выстаўка ІТБК. Там на тры дні загучала беларуская мова, беларуская музыка ды сьпевы.

Цікавасць да стэнда была ўвесь час. *Большасць з падыходзячых да нас былі* патомкамі беларусаў у Сібіры. Яны паведамлялі гісторыі , як іх продкі ў надзеі здабыць зямлю калісьці прыехалі ў Сібір ды так і засталіся тут. Мы ў сваю чаргу прапанпавалі да нас далучацца і дарылі газеты ды календарыкі ІТБК. Сучасную моладзь больш цікавіла беларуская музыка. Найбольшы спрос мелі касеты груп «Юр'я», «Харошкі», «Стары Ольса». Сярэдневяковая музыка ў сучасным прафесійным выразе нашых *знакамітых гуртоў*, асабліва з выкарыстаннем старажытных музычных інструментаў – гэта цуд. Людзі зварочваліся, слухалі, пыталіся пра выканаўцаў гэтай музыкі. Дзецям было цікава разглядаць вырабы з саломкі. Маску казы ды брылі некаторыя з іх жадалі і прымерыць. Дарослыя неаднойчы пыталіся, ці можна той ці іншы выраб купіць. А яшчэ пыталіся, чаму менавіта маска казы на нашам паказе…Яна такая цікавая, нейкая сіла ёсьць у ёй ад майстра, які яе выканаў. Прыцягвала позіркі яна моцна. Нездарма…Каза ў беларусаў сымбал здароўя і дабрабыту. Яна на паказе нашым была нашым абярогам, талісманам.

Людзі…Людзі… Шмат людзей. Рэкі.

Былі споршчыкі, якія былі б не яны, калі б не сцвярджалі стэрэатыпна , што аніякай розніцы няма паміж традыцыямі рускай і беларускай куль туры. *Былі здзіўлёныя ад таго, што* ў Іркуцку існуе Таварыства беларускай культуры. Нічога сабе! Былі жадаючыя, каб ІТБК накіравала іх турыстамі ў Беларусь…Былі зацікаўленыя ў супрацоўніцтве.

Усіх запрашаем да нас.

На трэці дзень у нашых суседзяў побач з Еўрэйскага цэнтру ўжо з языкоў злятаці беларускія славечкі…

Таццяна Бізікава.

СЯБРОЎСКІЯ СКЛАДКІ

Рада ИТБК искренне благодарит всех наших друзей за сдачу взносов на деятельность нашего Товарищества. Мы напоминаем, что на 5-ом Съезде нашей организации было решено утвердить **минимальный** взнос с каждого члена ИТБК **100 рублей в год.** Безусловно, это минимум, который мы надеемся **каждый** сможет уплатить.

Кто может больше – ещё лучше.

Взносы можно сдать в нашей Сядзібе по адресу: **ул. Чехова, д.2. тел. 20-11-72.**

Сядзіба работает: ежедневно с 16.00 до 19.00 часов, кроме воскресенья.

Также можно осуществить перечисления на наш расчётный счёт:

Банковские реквизиты: «Востсибтранскомбанк» Р/с 40703810300001037701; ИНН 3808029567; БИК 042520849; К/с 30101810700000000849; «ИТБК им. Я. Д. Черского».

Взносы в феврале 2004 года сдали: Яковенко В. К., Демидова Н. В., Кухарев А. А., Смирнова И. А., Огаркова Е. А., Шинкарёв В. В., Сурепова Е. С.

Усім сябрам Вялікі Дзякуй за падтрымку нашай супольнасці.

Жыве Беларускі народ! Жыве Беларусь!

ВЕСТКІ З БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

"Газавая вайна"

«Газавая вайна» - толькі пачатак праблемаў, якія прынесла краіне панаваньне Лукашэнкі.

18-19 лютага ў эканамічных дачыненьнях Беларусі й Расеі пачаўся самы жорсткі за найноўшую гісторыю крызыс, зьвязаны з даставамі ў нашую краіну расейскага газу. Як заявіў А.Лукашэнка, ён пагадзіўся з умовамі Пуціна, каб аднавіць паступленьне газу ў Беларусь.

Сытуацыю камэнтуе старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка:

-- Адказны кіраўнік краіны ніколі б не давёў сытуацыю з энэрганосьбітамі да крайнасьці. Нашыя суседзі - Літва, Эстонія, Польшча, Украіна - ня маюць сур'ёзных праблемаў з газам. Яны не гулялі ў "саюзныя дзяржавы", а будавалі сваю ўласную незалежную дзяржаўнасьць. Гэтыя краіны размаўлялі з Расеяй не як "малодшыя браты", а як годныя роўныя партнэры. Яны не абяцалі Маскве ўвесьці ў сябе расейскі рубель узамен за цэнавыя льготы, а заключалі рынкавыя пагадненьні пра пастаўкі й транзыт. Таму Масква ня сьмее размаўляць зь імі мовай шантажу. Лукашэнка ж сваёй палітыкай разбурае асновы незалежнай беларускай дзяржаўнасьці, закладзеныя ў пачатку 90-х гадоў, і робіць нашу краіну зручным аб'ектам для газавага шантажу. Грамадзтва ня ведае, на якія саступкі Расеі ён пайшоў дзеля таго, каб пастаўкі газу ўзнавіліся, і што з такім кіраўніцтвам чакае нашу незалежнасьць заўтра. Што рабіць у гэтай сытуацыі? Дзеля дабра беларускага народу, дзеля цяпла ў нашых дамах я б настойліва папрасіў Лукашэнку тэрмінова сысьці ў адстаўку як чалавека, ня здольнага кіраваць незалежнай краінай і абараняць яе інтарэсы ва ўмовах рынкавай эканомікі. Пры ўмове аднаўленьня дэмакратыі Беларусь ня будзе ізаляваная ад сьвету, у краіну прыйдуць заходнія інвэстыцыі, а самае галоўнае - той, хто працуе, будзе нармальна зарабляць. І тады ніякі расейскі газавы шантаж нам ня будзе страшны.

ПРЭС-РЭЛІЗ:

23 лістапада 2003 года ў Бабруйску сіламі мясцовай арганізацыі БНФ, ладзілася акцыя. На рынку (Заходні), дзесяць сяброў бабруйскай гарадской арганізацыі БНФ праводзілі сацыяльнае апытанне жыхароў горада. У анкетах было прапанавна тры пытання: 1. палепшыўся ці пагоршыўся ўзровень жыцця апошнім часам, 2. ці згодны аплочваць 100% камунальных паслуг, улічваючы тое, што сення аплочваем 60%, 3. ці згодны з падоўжаннем срока прэзідэнцкіх паўнамоцтваў А.Г. Лукашэнкі вышэй за два срока, згодна з канстытуцыяй. Ў 90% апытаных жыцце апошнім часам пагоршылася. 98% супраць павышэння тарыфаў на камунальныя плацяжі. Толькі 75% супраць падоўжання прэзідэнцкіх паўнамоцтваў А.Г. Лукашэнкі. 15% не змаглі адказаць на трэцяе пытанне. 10% працэнтаў падтрымаюць прэзідэнта. Было апытана 498 чалавек. Што цікава, адна жанчына якая падтрымлівае Лукашэнку выказалася за тое, што трэба тэрмінова закрыць мяжу з Расеяй. Прэсавая служба Бабруйскай гарадской арганізацыі БНФ. 24.11.03г.

www.pbnf.org -- сайт Партыі БНФ. Пішыце: pbnf@pbnf.org

Газета «Маланка» издаётся при финансовой поддержке Владимира Кузьмича Яковенко.
Редакция выражает искреннюю благодарность Вам, Владимир Кузьмич,
и надеется на долгосрочное сотрудничество.

Рэдактар: Алег Рудакоў.
Заснавальнік: ІТБК імя Яна Чэрскага.
Адрас Рэдакцыі: 664011, Расія, г. Іркуцк, вул. Чэхава, д.2.
Тэлефон Рэдакцыі: (3952) 20-11-72
e-mail: malanka2000@mail.ru